# СЯМ'Я І НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

*С.Р. Туболец*
*Віцебск, УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"*

Сучасны стан трансфармацый культуры, сямейнага жыцця, поглядаў, палітычных і эканамічных сістэм патрабуе больш уважлівых адносін да традыцый, культуры, стылю жыцця свайго народа. Аналіз гістарычных, культурных, педагагічных аспектаў перамен патрабуе звароту да народна-педагагічнай спадчыны беларусаў на момант яе найвышэйшага росквіту – канец XIX – пачатак XX стагоддзяў. Народная педагогіка захавала шмат скарбаў, актыўные ўжыванне якіх дазволяць сучасным прафесіяналам выхавання пераламіць негатыўныя тэндэнцыі дэкультурызацыі жыцця.

Эстэтычнае выхаванне рыхтуе асобу да найбольш аптымальнага і адэкватнага пачуццёва-эмацыянальнага, якаснага ўваходу ў рэальнае жыццё свайго грамадства. Зварот да вышукаў у галіне традыцыйнага эстэтычнага выхаванння ў беларускай народнай педагогікі з'яўляецца спробай, праз вылучэнне народных традыцый эстэтычнага выхавання, намеціць шляхі ўвядзення іх у практыку.

Мэта нашага даследавання – вырашэнне пытання эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX ст.

**Матэрыял і метады.** Аб'ект даследавання: беларуская народная педагогіка. Прадмет даследавання: традыцыя эстэтычнага выхавання ў беларускай сялянскай сям'і канца XIX – пачатку XX стагоддзяў. Даследаванне выканана з выкарыстаннем комплексу узаемадапаўняльных метадаў: апісальна-аналітычнага, параўнальна-гістарычнага, а таксама гісторыка-педагагічнага аналізу, навукова-даследчых прыёмаў (інтэрпрэтацыя, супастаўленне, сістэматызацыя).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Найбольш значны сацыяльны інстытут выхавання чалавека – сям'я. Народная педагогіка беларусаў пераважна сямейная, сфера практычнай дзейнасці бацькоў па выхаванні дзяцей на аснове традыцый сям'і, з улікам рэгіянальных і культурных асаблівасцей. Менавіта сям'я закладвае падмурак эстэтычнага выхавання, абуджае эстэтычныя пачуцці, вучыць бачыць, успрымаць, разумець і ацэньваць прыгожае. Сямейнае выхаванне дае магчымасць найбольш рана і эфектыўна весці дзіця па шляху па-першае, ўспрыняцця, разумення прыгажосці, па-другое, стварэння і захавання прыгажосці зносін, працы, творчасці, прыроды.

Метады, скіраваныя на ўспрыняцце і разуменне прыгажосці (інтравертаванага тыпу): зварот да эстэтычнага пачуцця, унушэнне, перакананне, назіранне, гульня, праца, прыклад і аўтарытэт, парада, прывучанне, тлумачэнне, гутарка, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, павага да старэйшых. Іх галоўная мэта – далучыць асобу да свету прыгажосці праз развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (непрыгажосці).

Эстэтычныя пачуцці з'яўляюцца ў дзіцяці вельмі рана. Яны развіваюцца пад уздзеяннем выхавання і навучання на аснове пачуццёвага ўспрыняцця, пазнання рэальнага свету і ўспрыняцця мастацтва. Традыцыйна з першых дзён маленькага беларуса суправаджаюць песні, што развіваюць слых дзіцяці, садзейнічаюць развіццю эстэтычнага ўспрыняцця. Першыя ўнушэнні, перакананні, знаёмства з наваколлем ідзе праз матчыну песню. Потым час гульні, якая спрыяе актыўнаму фарміраванню непасрэднага пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці ў свядомасці. Пацешкі і забаўлянкі незаменныя ў набыцці дзецьмі вопыту эмацыянальных



Репозиторий ВГУ

зносін. Каштоўнасныя адносіны да людзей знаходзяць сваё выражэнне ў вялікай колькасці слоў, што перадаюць пачуццё як пяшчоты і хараства, так агіды і непрязнасці. Адзін з метадаў выхавання – запалохванне – заснаваны на высокай унушальнасці дзяцей, вобразнасці іх успрыняцця і мыслення.

Значную ролю ў сямейным выхаванні адыгрывалі назіранні за паводзінамі, узаемнымі адносінамі родных, асаблівасцямі выканання спраў. Яны дапамагаюць запомніць традыцыйныя формы правядзення святаў, даюць веды аб тым, каго грамадская думка ацэньвае высока і за што. Назіранні спалучаюцца з растлумачэннямі, унушэннямі, пераканаmenнямі – распаўсюджанымі і даступнымі метадамі эстэтычнага выхавання. Дзяцей пераконвалі ў неабходнасці прыгажосці ў адносінах з людзьмі, паводзінах, працы, дамашнім побыце. З узростам дзяцей пашыралася прымяненне метадаў: растлумачэнне суправаджалася аналізам, больш глыбокім і дэталёвым, дзеці атрымлівалі веды аб сутнасці эстэтычных поглядаў народа, яго норм і правіл.

Дзеці – актыўныя ўдзельнікі жыцця, і дарослыя адчуваюць свой абавязак перадаць ім скарб ведаў, у тым ліку і эстэтычных, праз гутаркі, казкі, прыказкі. У казачных творах найбольш прывабнымі рысамі надзелены станоўчыя героі, каб падкрэсліць, давесці думку аб непарыўнай еднасці дабрыні і прыгажосці. Для беларусаў прыгажосць чалавека ў працоўнай актыўнасці, што фарміруе традыцыю прадстаўлення фальклорнага героя як знешне прыгожага працавітага асілка. Адначасова казкі пераконваюць і даказваюць неабходнасць глыбокай ацэнкі чалавека, патрабуюць адрозніваць яго ўнутраны свет ад знешняга выгляду, умець бачыць духоўную прыгажосць ці выродлівасць. Функцыя пераканання і ўнушэння выразна высвечваецца ў прыказках і прымаўках. У суадносінах з традыцыйнымі народна-педагагічнымі поглядамі на эстэтычнае выхаванне яны ўслаўляюць прыгажосць чалавека-працаўніка, сумленнага, высокамаральнага і добрага.

У сямейным выхаванні пастаянна прысутнічае праца – земляробчая, хатняя, па догляду дамашняй жывёлы, рамесніцкая, – прасякнутая эстэтычнымі перажываннямі. У народнай працоўнай творчасці праяўляюцца густ і духоўныя памкненні чалавека, што прайшлі праз прызму нацыянальных традыцый. Эстэтызацыя акаляючага асяроддзя аказвае ўскосны ўплыў на выхаванне падрастаючага чалавека. Важным элементам эстэтычнага выхавання ў сям'і з'яўляецца і хатняя праца, да якой прывучаюць мэтанакіравана, паступова і абавязкова патрабуюць прыгожага, стараннага, творчага выканання.

Калі дзіця паводзіла сябе адпаведна ўяўленням народа аб прыгажосці, працы, адносін, бацькі ўхвалялі, адабралі ўчынкі, выказвалі станоўчыя адносіны. У якасці ўхвалення бацькі выкарыстоўвалі ўсмешку, удзячнасць, даручэнне больш складанай справы, падзяку, падарунак. Аднак, калі дзіця не выконвала патрабаванняў, бацькі выкарыстоўвалі пакаранні. Найбольш пашыранымі яго формамі былі вусныя.

Група экстравертаваных метадаў прадстаўлена наступнымі: практыкаванне, ухваленне, праца, вымова, прывучэнне, іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, сумеснае правядзенне вольнага часу, гульні, пастаноўка перспектывы, супрадкі. Іх спецыфічная рыса - скіраванасць на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць зносін, працы, творчасці, прыроды. Шмат народных правіл, звычаяў мае сэнс – упрыгожыць жыццё.

Зразумела, праца як асноўны метад народнай педагогікі стаіць у шэрагу першых. З яе дапамогай адбываюцца ўсе перамены: з'яўляюцца і ўпрыгожваюцца вырабы, арганізуецца дзейнасць. Бацькі выступаюць прыкладам для сваіх дзяцей, усё добрае і ўсё благое – ад іх. Менавіта бацькі з'яўляюцца тым прыкладам, які



Рэпазіторый ВДУ

садзейнічае ўзнікненню эстэтычна значнай дзейнасці. У сям'і дзеці бачаць першыя праявы мастацкага аздаблення вырабаў, эстэтычных адносін, чуюць першыя патрабаванні, падмацаваныя работай бацькоў. Нават самае просценькае заданне малыя павінны выканаць прыгожа. Каб гэта атрымалася, родныя паказваюць прыёмы працы, тлумачаць, а потым і патрабуюць прыгожага выканання. Хутка далучаецца грамадская думка. Яе ўплыў на эстэтычна значную дзейнасць ідзе праз практычныя парады.

Беларусы надаюць увагу фізічнай прывабнасці чалавека. Менавіта ў сям'і перадаюцца сакрэты касметычных сродкаў для захавання прыгажосці: практычныя і магічныя. Аднак беларусы былі глыбока ўпэўнены, што, акрамя фізічнага здароўя і моцы, чалавек павінен валодаць і высокай маральнасцю, культурай. Праз выхаваўчыя падыходы сям'і дзіця набліжаецца да эстэтычнага ідэалу народа.

**Заключэнне.** Традыцыі эстэтычнага выхавання дзяцей ў сямейным улонні, якія склаліся ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX – пачатак XX ст.) праз метады інтравертаванага і экстравертаванага кшталту, што скіраваны на ўспрыняцце, разуменне прыгажосці, па-другое, стварэння і захавання прыгажосці зносін, працы, творчасці, прыроды, даказалі сваю эфектыўнасць і патрабуюць творчага прымянення ў сучаснай практыцы.

Репозиторий ВГУ